Дысцыпліна **“Гісторыя дзяржавы і права Беларусі”**

**Мэтай** вучэбнай дысцыпліны з’яўляецца выпрацоўка разумення сутнасці гістарычных працэсаў, навыкаў усведамлення галоўных грамадскіх падзей, якія на іх уплывалі, выяўленне важнейшых тэндэнцый і заканамернасцяў гістарычнага развіцця, асэнсаванне адметнасці эвалюцыі нацыянальнай дзяржаўнасці і бачанне перспектыў яе будучыні. На падставе сістэмнага вывучэння помнікаў права студэнты змогуць набыць навыкі аналізу гістарычнага нарматыўнага прававога матэрыялу, што дапаможа ім пры засваенні курсаў галіновых юрыдычных дысцыплін вылучаць станоўчыя рысы і добрую вартасць сучаснага заканадаўства, а таксама выяўляць яго недахопы.

Такім чынам, усведамленне гісторыі айчыннай прававой сферы мае і практычныя мэты – развіццё ў перспектыве яшчэ больш дасканалага нацыянальнага заканадаўства, найбольш адэкватнага сучаснай прававой свядомасці грамадства.

**Змест вучэбнага матэрыяла.**

Прадмет гісторыі дзяржавы і права Беларусі і яго асаблівасці. Гістарыяграфія, перыядызацыя. Грамадска-палітычны лад і права ў Беларусі ў перыяд усталявання дзяржаўнасці ўсходніх славян (IX ст. -- першая палова XIII ст.). Беларускія землі ў складзе Вялікага Княства Літоўскага. Грамадкі лад дзяржавы. Дзяржаўна-палітычны лад Вялікага Княства Літоўскага. Уніі з Полышчай. Судовая сістэма Вялікага Княства Літоўскага. Судаводства. Прававая сістэма Вялікага Княства Літоўскага. Грамадска-палітычны лад і права Беларусі ў складзе Рэчы Паспалітай абодвух народаў (XVII–XVIII стст.). Грамадска-палітычны лад і права Беларусі ў складзе Расійскай імперыі. Грамадска-палітычны лад і права Беларусі ў перыяд рэвалюцыйных перамен і адраджэння беларускай дзяржаўнасці (1917–1920 гг.). Асаблівасці дзяржаўна-прававога развіцця Беларускай ССР у 20-30-я гады XX ст. Уз’яднанне Заходняй Беларусі з Беларускай ССР у пачатку другой сусветнай вайны. Беларуская ССР у перыяд Вялікай Айчыннай вайны. Дзяржава і права Беларускай ССР у другой палове 40-х – першай палове 80-х гадоў XX ст. Дзяржава і права Беларускай ССР на пачатку кардынальных рэформаў у СССР. Абвяшчэнне незалежнасці рэспублікі (другая палова 80-х – пачатак 90-х гг.). Дзяржава і права Рэспублікі Беларусь у канцы XX – пачатку XXI стст.

Засваенне вучэбнай дысцыпліны «Гісторыя дзяржавы і права Беларусі» павінна забяспечыць фарміраванне наступных **базавых прафесійных кампетэнцый (БПК):**

БПК-2. Выкарыстоўваць гістарычны вопыт для ўдасканальвання сістэмы дзяржаўных органаў, судовай сістэмы, заканадаўства, прававых крыніц, інстытутаў, галін права.

На падставе засваення вучэбнага матэрыялу навучэнцы павінны:

***ведаць:***

канцэптуальныя асновы і храналагічную паслядоўнасць развіцця беларускай дзяржаўнасці і прававой сістэмы;

асноўныя этапы станаўлення дзяржаўнасці на тэрыторыі Беларусі, беларускай дзяржаўнасці, дзяржаўнага суверэнітэту Рэспублікі Беларусь;

помнікі права, дасягненні прававой культуры Беларусі, эвалюцыю важнейшых прававых інстытутаў і галін права;

асаблівасці гістарычнага развіцця дзяржаўных органаў, судовай сістэмы, заканадаўства Беларусі;

канцэптуальныя асновы гісторыі дзяржавы і права Беларусі;

асноўныя этапы і храналагічную паслядоўнасць развіцця беларускай дзяржаўнасці;

асноўныя катэгорыі, паняцці і дасягненні, якія характарызуюць ўзровень гістарычнага развіцця прававой культуры Беларусі;

прававыя крыніцы, асаблівасці функцыяніравання і гістарычнага развіцця дзяржаўных органаў і заканадаўства;

эвалюцыю прававога становішча насельніцтва;

характэрныя рысы і асаблівасці гістарычнага развіцця важнейшых прававых інстытутаў і галін права;

***умець:***

характарызаваць важнейшыя дасягненні прававой культуры беларускага народа;

выяўляць аб'ектыўныя заканамернасці эвалюцыі прававых інстытутаў і заканадаўства;

тлумачыць праблемныя пытанні гісторыі дзяржавы і права Беларусі і аргументаваць уласныя пазіцыі;

выкарыстоўваць атрыманыя веды для паспяховага засваення галіновых юрыдычных дысцыплін і фарміравання навуковага светапогляду;

***валодаць:***

асноўнымі метадамі, спосабамі і сродкамі атрымання, перапрацоўкі гісторыка-прававой інфармацыі;

навыкамі асваення гісторыка-прававога матэрыялу;

агульнымі для юрыспрудэнцыі катэгорыямі і паняццямі;

комплексам навуковых ведаў па гісторыі дзяржавы і права Беларусі.

**Методыка вывучэння вучэбнай дысцыпліны** «Гісторыя дзяржавы і права Беларусі» заснавана на аптымальным спалучэнні тэарэтычнага навучання, самастойнай працы і практычнага прымянення атрыманых ведаў, што дазволіць належным чынам арганізаваць вывучэнне гісторыі дзяржавы і права Беларусі. Асноўнай формай работы студэнтаў з’яўляюцца лекцыі, семінарскія заняткі, напісанне рэфератаў, кантрольных работ, тэсціраванне, а таксама самастойнае вывучэнне асобных тэм курса. Выкарыстоўваюцца медаты кантроля, самакантроля і самацэнкі. Прымяняюцца сучасныя метады мультымедыйныя тэхналогіі, якія забяспечваюць нагляднасць выкладання, тэставая сістэма праверкі ведаў.

Гісторыя дзяржавы і права Беларусі цесна звязана з такімі юрыдычнымі дысцыплінамі, як «Агульная тэорыя права», «Гісторыя дзяржавы і права

замежных краін», «Канстытуцыйнае права Рэспублікі Беларусь», «Канстытуцыйнае права замежных краін», «Гісторыя палітычных і прававых вучэнняў», «Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі».

Спецыяльныя галіновыя юрыдычныя навукі чэрпаюць з гісторыі дзяржавы і права Беларусі пэўныя гістарычныя звесткі, факты, якія дапамагаюць прасачыць эвалюцыю той або іншай дзяржаўна-прававой з'явы, прававога інстытута, якія маюць глыбокія гістарычныя карані, але разам з тым актуальныя і зараз.

Гісторыя дзяржавы і права Беларусі, як адна з фундаментальных юрыдычных дысцыплін, дапамагае будучаму юрысту не толькі стаць сапраўдным прафесіяналам у прававой сферы, але і сфарміраваць уласную грамадзянскую пазіцыю па актуальных пытаннях дзяржаўна-прававога развіцця і ўвогуле – стаць інтэлектуальнай асобай і патрыётам сваёй Айчыны.

Размеркаванне аўдыторных гадзін па відам заняткаў і семестрам.

| Семестр | Количество академических часов | | | | | | | Форма промежуточной аттестации |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | Всего | Аудит. | Из них | | | | | |
| | | | Лекции | Лабор. занятия | Практ. занятия | Семи-нары | УСР | |
| Вочная (дзённая) форма атрымання вышэйшай адукацыі | | | | | | | | |
| 1 | 198 | 96 | 40 | | | 28 | 28 | Экз. |
| Усяго | 198 | 96 | 40 | | | 28 | 28 | |
| Завочная форма атрымання вышэйшай адукацыі (Правазнаўства) | | | | | | | | |
| 1 (уст) | 8 | 8 | 8 | | | | | |
| 1 | 190 | 14 | 8 | | | 6 | | Экз. |
| Усяго | 198 | 22 | 16 | | | 6 | | |
| Завочная скарочаная форма атрымання вышэйшай адукацыі | | | | | | | | |
| 1 (уст) | 4 | 4 | 4 | | | | | |
| 1 | 194 | 8 | 4 | | | 4 | | Экз. |
| Усяго | 198 | 12 | 8 | | | 4 | | |